# Будоўлі цаліны чакаюць вас, гарачых, дужых, маладых!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (526) Субота, 18 мая 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## На цаліну!

Шырока, бязбрэжна раскінуліся Уральскія стэпы. Паездзіш па іх суткі, другія, і міжволі перад вачыма паўстае мора— бясконцае багацце святла, паветра, прасторы.

Стэп... Яшчэ зусім нядаўна ён жыў стагоддзямі ўстаяўшымся жыццём. З года ў год па ім імчаліся перакаці-поле, цягнуліся насустрач шчодраму сонцу жоўтыя, чырвоныя, белыя цюльпаны, мітусіліся суслікі, ды, расправіўшы магутныя крылы, горда парылі ў бязвоблачным небе арлы.

Але вось прыйшлі людзі і разбудзілі драмаўшы стэп. Па ім пабеглі адзін за адным слупы электраліній, пацягнуліся караваны аўтамашын і трактараў.

Напружаным жыццём жывуць цяпер цаліннікі. Трэба своечасова пасеяць каласавыя, добра правесці акот аўцаматак.

Цаліна — край новабудоўляў. Няма там цяпер ніводнага саўгаса, дзе б не будаваліся бальніцы, клубы, школы, вытворчыя памяшканні, жылыя дамы. Велізарны аб'ём будаўніцтва патрабуе вялікай колькасці працоўных рук. У гэтым годзе больш двух тысяч беларускіх студэнтаў паедуць у Заходне-Казахстанскі край. Палітэхнікі і тэхнолагі, медыкі і машынабудаўнікі, педагогі і юрысты стануць будаўнікамі.

Студэнтам нашага універсітэта таксама выпаў гонар удзельнічаць у гэтай высакароднай справе. 250 пасланцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна будуць працаваць улетку ў саўгасах Зеляноўскага тэрытарыяльна-вытворчага ўпраўлення Уральскай вобласці. Саўгасы, дзе нам прадстаіць працаваць, адны з лепшых не толькі ва ўпраўленні, але і ў вобласці. У кожным з гэтых саўгасаў — «Пермскім», «Стэпавым», «Ульянаўскім», імя М. В. Фрунзе— ёсць клубы, стацыянарныя кінаўстаноўкі, бібліятэкі, школы. А саўгас імя Фрунзе мае духавы аркестр і футбольную каманду.

Што мы будзем будаваць? Гэта, у асноўным, вытворчыя памяшканні — кароўнікі, аўчарнікі, цяпліцы, а таксама жылыя дамы і школы.

Падрыхтоўчы штаб цаліннікаў зараз займаецца камплектаваннем будаўнічых атрадаў. Аснову іх складаюць фізікі, матэматыкі, юрысты. У атрадах будзе па 50 чалавек. Кожны атрад будзе разбіт на 2 комплексныя брыгады, у састаў якіх увойдуць муляры, тынкоўшчыкі, цесляры, бетоншчыкі, падсобныя рабочыя.

Для тых, хто не мае будаўнічых спецыяльнасцей, будтрэст № 5 г. Мінска арганізуе кароткатэрміновыя курсы.

У атрадах ствараюцца камсамольскія арганізацыі і партыйныя групы, выбіраюцца рэдкалегіі насценных газет, арганізуецца мастацкая самадзейнасць, камплектуюцца спартыўныя каманды.

Вялікую выхаваўчую работу прадстаіць правесці нашым студэнтам на цаліне. Мы будзем не толькі працаваць фізічна, але і дапамагаць мясцовым грамадскім арганізацыям у правядзенні гутарак і лекцый, выступаць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, дапамагаць у афармленні нагляднай агітацыі, у падборы рэпертуарных зборнікаў для саўгасных клубаў.

Да работы мы павінны прыступіць 10 ліпеня. З Мінска студэнцкія будаўнічыя атрады ўсёй Беларусі паедуць у самым пачатку ліпеня. На цаліне нашы атрады прабудуць у сярэднім па 2,5 месяца. Праезд у абодва бакі — за кошт саўгасаў.

Кожны, хто запісаўся ў будаўнічы атрад, павінен разумець, што едзе ён не адпачываць, а працаваць. Будзе часам ныць спіна ад стомленасці, будуць балець напрацаваныя рукі, але затое якой вялікай радасцю напоўніцца сэрца кожнага, калі ў стэпу забялеюць пабудаваныя ўласнымі рукамі дамы і школы, клубы і бальніцы!..

Цаліна — край смелых духам і целам. Хто хоча праверыць сябе ў цяжкасцях, абавязкова павінен ехаць на цаліну, на будоўлі!

Канстанцін СУЧКОЎ,
начальнік штаба цаліннікаў

ЗАДЫМИЛИ ГОЛУБЫМ ТУМАНОМ
НА СТЕПНЫХ КУРГАНАХ КОВЫЛИ.
В СТЕПЬ УХОДЯТ ПОЛЕВЫЕ СТАНЫ,
И КОМБАЙНЫ ДВИЖУТСЯ ВДАЛИ.

ВЕТЕРОК БЕЖИТ, ХЛЕБА КАЧАЯ,
А ПРОСТОРЫ ГЛАЗОМ НЕ ОБНЯТЬ.
ЦЕЛИНА — ХОЗЯЙКА МОЛОДАЯ —
ХЛЕБОМ-СОЛЬЮ РАДА НАС ВСТРЕЧАТЬ.

О. ГОЛОВКИН.

## Добры дзень, зямля цалінная!

У вестыбюлі галоўнага корпуса універсітэта, ля аб'яў, стаіць група студэнтаў.

— Можа, зноў які цікавы канцэрт? — міжволі ўзнікае думка.

Але вось студэнты пачалі спрачацца, разважаць...

— А што, калі ўсім курсам пакацім на цаліну?!

— Спачатку здай сесію, а потым думай аб гэтым.

— Здадзім і на цаліне пабываем...

Як толькі стала вядома, што студэнтаў БДУ «клічуць гоні цалінныя», заявы адна за адной сталі паступаць у камітэт камсамола універсітэта і факультэтаў. За кароткі тэрмін каля 300 студэнтаў выказалі жаданне ехаць на цалінныя новабудоўлі.

Начальнік штаба цаліннікаў Канстанцін Сучкоў ездзіў на «разведку» у Заходне-Казахстанскі край, дамовіўся з мясцовымі арганізацыямі аб будаўнічых аб'ектах. Цяпер у штабе цаліннікаў гарачыя дзянькі: трэба стварыць будаўнічыя атрады і поўнасцю праінфармаваць усіх цаліннікаў аб умовах і тэрмінах паездкі.

З кожным днём палку цаліннікаў прыбывае і прыбывае. Калектыўныя заявы студэнтаў 3 групы 1 курса фізічнага факультэта, некаторых груп 2 курса фізфака, юрфака, матфака і іншых факультэтаў. Паступаюць таксама шматлікія індывідуальныя заявы.

Добраахвотнікі універсітэта паедуць ва Уральскую вобласць. Іх будучыя саўгасы — маладыя, нядаўна ўзнікшыя гаспадаркі, і работы там хоць адбаўляй. Але цяжкасці не палохаюць нашых камсамольцаў. Яны цвёрда ведаюць, што іх месца там, на лініі агню, наперадзе.

Хутка, вельмі хутка эшалоны цаліннікаў возьмуць курс на Казахстан.

Іван КАПЫЛОВІЧ.

## Атрады цаліннікаў укамплектаваны

У сераду, 15 мая, бюро камітэта камсамола універсітэта сумесна з штабам цаліннікаў правяло камплектаванне студэнцкіх будаўнічых атрадаў і зацвердзіла камандзіраў гэтых атрадаў.

Зводны атрад матэматычнага і юрыдычнага факультэтаў будзе працаваць у саўгасе **імя М. В. Фрунзе**. Камандзір атрада — **Канстанцін Сучкоў**, студэнт 2 курса гістарычнага факультэта.

Атрад 3 курса фізічнага факультэта і студэнты гістарычнага факультэта паедуць працаваць у саўгас **«Стэпавы»**. Камандзір атрада — асістэнт фізічнага факультэта **Уладзімір Лаўрукові̇ч**.

Атрад 2 курса фізічнага факультэта і студэнты хімічнага факультэта паедуць працаваць у саўгас **«Ульянаўскі»**. Камандзір атрада — **Васілій Стражаў**, студэнт 2 курса фізічнага факультэта.

Атрад 1 курса фізічнага факультэта і студэнты філалагічнага факультэта будуць працаваць у саўгасе **«Пермскі»**. Камандзір атрада — **Васілій Чумакоў**, студэнт 2 курса фізічнага факультэта.

## Адзін за ўсіх, усе за аднаго

Прайшло дзесяць гадоў пасля першага закліку на цалінныя землі. Роўна дзесяць гадоў, але якія змены! Былая цаліна — ужо не цаліна. Гэта квітнеючы, багацеючы з кожным годам край. Небывалыя ўраджаі, многа мяса, малака, гародніны.

Дзесяць гадоў назад ставілася задача закласці трывалую аснову сельскагаспадарчай вытворчасці на цалінных землях. І першыя цаліннікі з гэтай задачай справіліся. Вялікімі ўраджаямі радавала цаліна Радзіму. З кожным годам павялічваліся ўраджаі, расло пагалоўе жывёлы. Паявіліся цяжкасці. Не хапае зернесховішчаў, памяшканняў для ўтрымання жывёлы.

І цяпер Радзіма заклікае нас, студэнтаў, дапамагчы захаваць багацце цалінных зямель, кліча на пярэдні край будаўніцтва.

У гэтыя дні ва універсітэце фарміруюцца атрады добраахвотнікаў. Нам неабходна арганізаваць работу і жыццё брыгад на цаліне ў поўнай адпаведнасці з маральным кодэксам будаўніка камунізма. Трэба, каб кожны член брыгады адчуваў адказнасць перад калектывам, каб прынцып «Адзін за ўсіх, і ўсе за аднаго» быў непахісны ва ўсім жыцці студэнтаў-будаўнікоў.

Віктар ГЛАЗУНОЎ,
студэнт 1 курса юрфака.

# З гісторыі цалінных будняў студэнтаў Белдзяржуніверсітэта

* * *

У 1958 годзе 650 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна дапамагалі цаліннікам Какчэтаўскай вобласці ўбіраць багаты ўраджай. Сёння мы публікуем некалькі матэрыялаў, знойдзеных у архіве рэдакцыі нашай газеты, якія расказваюць аб буднях цалліннікаў 1958 года. Праўда, тады студэнты БДУ працавалі пераважна на ўборцы ўраджаю, а цяпер едуць на цалінныя новабудоўлі. Але, па сутнасці, і сёлета нашы студэнты дапамогуць убіраць ураджай, бо вызваляць працаўнікоў саўгасаў ад будаўнічых работ.

## Наша дапамога цалліннікам

Мы працуем у зернесаўгасе «Цалінны» Рузаеўскага раёна Какчэтаўскай вобласці ў брыгадзе № 9. Уборка ўраджаю падыходзіць к канцу. Брыгада № 1 поўнасцю ўжо закончыла ўборку. Цяпер у нас даволі-такі складаныя кліматычныя ўмовы. Выпаў снег, пачаліся замаразкі. Але камсамольцы БДУ не спалохаліся цяжкасцей. Яны працягваюць паспяхова працаваць на шчасце роднай краіны. Дырэкцыя зернесаўгаса выдала нам усім цэплыя рэчы. Некаторыя з нас заяўляюць, што згодны застацца ў саўгасе да новага года.

Багаты ўраджай у гэтым годзе ў Казахстане. Сваё абяцанне — даць Радзіме мільярд пудоў збожжа—казахстанскія камсамольцы выканаюць з гонарам. У гэтай вялікай, высакароднай справе дапамагаем ім і мы, камсамольцы Беларусі.

**І. СЯРГЕЕЎ,**
**нам. сакратара камітэта камсамола БДУ.**

## Цалліннікі дзякуюць

**Рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**
**Сакратару партарганізацыі**
**Сакратару камітэта камсамола**
**Старшыні прафкома**

**ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!**

**Працаўнікам палёў Какчэтаўскай вобласці, вырасціўшым багаты ўраджай збожжавых, давялося ўбіраць яго ў вельмі цяжкіх надворных умовах.**

**Але, дзякуючы самаадданай працы работнікаў сельскай гаспадаркі і ўсіх працоўных, Какчэтаўская вобласць перавыканала гадавы план хлебанарыхтовак, прадала дзяржаве 128 мільёнаў 600 тысяч пудоў збожжа.**

**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за вялікія поспехі, дасягнутыя працоўнымі ў павелічэнні вытворчасці збожжа, Какчэтаўская вобласць узнагароджана ордэнам Леніна.**

**У сваім прывітанні Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў Саюза ССР павіншавалі ўсіх працоўных вобласці з высокай узнагародай і пажадалі ім далейшых поспехаў ва ўсенароднай барацьбе за стварэнне багацця прадуктаў для насельніцтва нашай краіны.**

**У барацьбе за хлеб вялікую дапамогу аказалі нам студэнты і рабочая моладзь братэрскіх рэспублік, гарадоў і абласцей РСФСР. Разам з працаўнікамі сельскай гаспадаркі нашай вобласці яны самаадданна працавалі на палях, пераадольваючы вялікія цяжкасці, звязаныя з неспрыяльным для ўборкі надвор'ем.**

**Какчэтаўскі абком камсамола просіць рэктарат, партыйную, камсамольскую і прафсаюзную арганізацыю універсітэта яшчэ раз выказаць глыбокую падзяку ад працоўных вобласці ўсім вашым студэнтам, прымаўшым удзел ва ўбоорцы ўраджаю 1958 года ў нашай вобласці, і перадаць ім наша шчырае пажаданне вялікіх поспехаў у вучобе і ў працы дзеля дабра нашай любімай Радзімы.**

**Какчэтаўскі абком ЛКСМ Казахстана.**

## Спаборніцтва латвійскіх і беларускіх студэнтаў

...У нас пачалася ўборка ўраджаю. А ён у гэтым годзе вельмі багаты, нават лепшы, чым быў у 1956 годзе. Так што прыдзецца многа папрацаваць. Зернесаўгас «Цалінны», у якім мы працуем, узяў абавязацельства здаць дзяржаве 3 млн. 100 тысяч пудоў пшаніцы. Па раёну мы арганізавалі спаборніцтва паміж латышамі і беларусамі. У «Цалінным» брыгада Сяргеева выступіла са зваротам да ўсіх студэнтаў універсітэта ўключыцца ў спаборніцтва паміж брыгадамі і ўзяла на сябе пэўныя абавязацельствы. Гэты зварот мы абмяркоўваем ва ўсіх брыгадах.

Нашы студэнты ўдзельнічаюць не толькі ва ўборцы, але і ў будаўніцтве. Так, гісторыкі і географы абавязаліся пабудаваць кароўнік, група юрыстаў—майстэрню, хлявы, надбудовы да жылых дамоў.

Ва ўсіх брыгадах выпускаюцца «баявыя» лісткі, у якіх расказваецца аб нашых справах.

З прывітаннем
**М. ГІЛЕВІЧ.**

Зернесаўгас «Цалінны».

## Працоўныя будні

Наш ударны камсамольскі атрад без ніякіх здарэнняў прыбыў у зернесаўгас «Цалінны» Какчэтаўскай вобласці.

Сустрэлі нас вельмі добра, нават з духавым аркестрам. На станцыі Пяскі адбыўся мітынг. Нас віталі вядомыя людзі раёна — Героі Сацыялістычнай Працы. Прысутнічаў і выступаў намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела ЦК ВЛКСМ тав. Тапыгін. Пасля мітынгу нас пачалі развозіць па саўгасах.

Са станцыі ў цэнтральную сядзібу саўгаса давялося зрабіць доўгае падарожжа (100 км) на аўтамашынах. Ехалі ноччу, і каля трох гадзін над цалліннымі прасторамі неслася задорная беларуская песня.

На начлег размясціліся ў вялікім зернескладзе ўсім атрадам у 450 чалавек. Спалі на сене. А раніцою размеркавалі нас па брыгадах. У саўгасе 10 брыгад. У 1, 2, і 10 працуюць філолагі. Палі гэтых брыгад граніцаць адно з другім і размешчаны бліжэй да цэнтра — 10—15 км. Самая далёкая брыгада 40 км ад цэнтра. Адлегласць, безумоўна, не малая, але калі ехаць на аўтамашыне па-цалліннаму з ветрыкам, яна пакрываецца за 30 мінут.

Жывём у палатках, вагончыках і зямлянках. Трэба сказаць, што месца трапілася добрае. Цэнтральная сядзіба саўгаса размешчана на беразе ракі Ішым. Саўгас вялікі і багаты. Толькі адной пшаніцай засеяна 35 тысяч гектараў. На палях багаты ўраджай. Мяркуецца сабраць з гектара не менш 15 цэнтнераў пшаніцы. Саўгас здасць дзяржаве 3 млн. пудоў пшаніцы. Зараз мы працуем на ўборцы кукурузы, гародніны. Дзённыя нормы выконваем на 120—130 працэнтаў. Хлопцы амаль ва ўсіх брыгадах ужо залічаны памочнікамі камбайнераў, а дзяўчаты — капнільшчыцамі.

Жывем весела. У нашай брыгадзе 30 студэнтаў і 25 механізатараў (так амаль у кожнай брыгадзе). Наладжваем танцы пад каломенскі патэфон або гармонік, калектыўныя прагулкі ў стэп, спяваем песні, гуляем ў валейбол. Але вольнага часу застаецца ўсё менш і менш. Наперадзе яшчэ многа-многа работы.

Шчырае цалліннае прывітанне усім студэнтам і выкладчыкам БДУ!

**Вячаслаў ЯНКОЎСКІ**
**Какчэтаўская вобласць,**
**Рузаеўскі раён,**
**зернесаўгас «Цалінны».**

## Клопаты сяброў

**Два гады запар убірала цаліны ўраджай Ніна Песенка, студэнтка 4 курса фізічнага факультэта. Яна добра ведае, як дорага ўвага сяброў. І пагэтаму яшчэ ў канцы жніўня, калі пачалі прыязджаць аднакурснікі ў Мінск, Ніна прапанавала: «Пашлем цалліннікам пасылку».**

**Падтрымалі Ніну Аркадзь Бародзіч, Рыгор Дрозд, Уладзімір Козіч, Света Барадзіна і многія іншыя аднакурснікі.**

**Тры пасылкі з лепшымі яблыкамі былі адпраўлены ў саўгас «Нежынскі» Какчэтаўскай вобласці.**

**А нядаўна ва ўніверсітэт прыйшла тэлеграма: «Дарагія сябры! Мы глыбока ўзрушаны вашай увагай. Сардэчна дзякуем за падарунак, які надаў нам яшчэ больш бадзёрасці і сілы. Запэўняем, што мы ў поўнай меры выкарыстаем іх для ўнясення дастойнага ўклада ў казахстанскі мільярд.**

**Да хуткай сустрэчы!**

**ШЭРШАНЬ, ШЧЭРБА, КУЗНЕЧЫК».**

(З газеты «Беларускі універсітэт» № 25 за 1958 год).

## Узнагароды пераможцам

За перамогу ў аглядзе-конкурсе насценных газет факультэтаў рэктар БДУ акадэмік А. Н. Сеўчанка аб'явіў падзяку і ўзнагародзіў Ганаровай граматай рэктарата і парткома БДУ рэдкалегію насценнай газеты біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію».

Рэдкалегіі газеты матэматычнага факультэта «Рашым любую задачу», заняўшай 2 месца, аб'яўлена падзяка і ўручана грамата рэктарата і парткома.

Рэдкалегіі газеты фізічнага факультэта «За навуку», занявшай трэцяе месца, аб'яўлена падзяка.

За актыўны ўдзел у рабоце насценнага друку загадам рэктара ўзнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата і парткома 6 найбольш актыўных супрацоўнікаў насценных газет і граматай рэктарата і парткома — 38 чалавек.

Граматамі рэктарата і парткома ўзнагароджаны таксама тры актыўных студкора газеты «Беларускі універсітэт»: Аляксандр Амельчанка (1 курс аддз. журналістыкі), Георгій Огій (2 курс вячэрняга аддз. журналістыкі) і Аляксандр Ніжко (4 курс біялагічнага факультэта).

## СПОРТ

### Рэкорд Я. Емяльянава

Студэнт 4 курса хімічнага факультэта Яўген Емяльянаў, які выступаў па-за конкурсам на спаборніцтвах летняй спартакіяды спартакаўскіх калектываў сярэдніх навучальных устаноў, выканаў норму майстра спорту і ўстанавіў новы рэкорд рэспублікі ў плаванні на 100 метраў спосабам дэльфін — 1.04,4. Ранейшы рэкорд В. Козырава, які трымаўся амаль чатыры гады, быў пераўзыйдзен роўна на 2 секунды.

### Поспех лабаранта гістфака

У Барысаве праходзіў чацвёрты традыцыйны матч мацнейшых скараходаў рэспублікі. У спаборніцтве на 20 кіламетраў удзельнічаў старшы лабарант гістарычнага факультэта майстар спорту Альберт Котаў. Ён заняў другое месца з часам 1 гадзіна 37 мінут 59,6 секунды, адстаўшы ад пераможца А. Базыленкі на 2 мінуты 32 секунды. А. Котаў атрымаў таксама спецыяльны прыз за лепшую спартыўную тэхніку.

## Набывайце аблігацыі 3-працэнтнай пазыкі

Дзяржаўная 3-працэнтная ўнутраная выйгрышная пазыка з'яўляецца зручнай і выгаднай для насельніцтва формай захоўвання грашовых зберажэнняў.

Даход па пазыцы ўстаноўлен у размеры 3 працэнтаў гадавых, у сярэднім за ўвесь тэрмін пазыкі выплачваецца ўладальнікам аблігацый у выглядзе выйгрышаў, якія разыгрываюцца штогод у шасці асноўных і адным дадатковым тыражах.

У асноўных тыражах на аблігацыю асноўнай вартасці—20 рублёў — разыгрываюцца выйгрышы па 5000, 2500, 1000, 500, 100 і 40 рублёў, а ў дадатковым, акрамя таго, 10000 рублёў. Па 10-рублёвых аблігацыях выплачваецца палавіна выпаўшага выйгрыша. Пры гэтым, набываючы дзве 10-рублёвыя аблігацыі замест адной 20-рублёвай, уладальнік гэтых аблігацый удзельнічае ў тыражах з большай колькасцю нумароў серый, што адпаведна павышае яго шанцы на выйгрыш.

Выйгрышы, выпаўшыя на аблігацыі ў асноўных тыражах, выплачваюцца незалежна ад тэрміна набыцця аблігацый. Выйгрышы, выпаўшыя ў дадатковых тыражах, выплачваюцца пры ўмове, калі аблігацыі былі набыты ў ашчаднай касе не менш чым за 9 месяцаў да тэрміна правядзення тыража і маюць пры сабе адпаведны талон на права атрымання выйгрыша.

Магчымасць выйгрыша па аблігацыі пазыкі павялічваецца з кожным тыражом, паколькі колькасць выйгрышаў, якія разыгрываюцца ў тыражах, застаецца нязменнай да канца тэрміна пазыкі, а выйграўшыя аблігацыі пагашаюцца пры выплаце выйгрышаў і ў далейшых тыражах не ўдзельнічаюць.

Аблігацыі пазыкі прадаюцца і свабодна купляюцца ашчаднымі касамі.

**У. Л. КОРХАЎ,**
**галоўны бухгалтар БДУ.**

**Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок,
галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 04318. Тыр. 2000 Зак. 1852.